**ДУК “Кобрынская раѐнная цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раѐна за сакавік 2018 г.**

## Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага дня

***2 сакавіка*** «Нет у любви бесследно сгинуть права…» - пад такой назвай для ўдзельнікаў «Універсітэта залатога ўзросту» і жыхароў горада адбылася літаратурна-музычная гасцёўня. Відэапрэзентацыя пазнаёміла прысутных з гісторыяй рамanса, са знакамітымі выканаўцамі і кампазітарамі гэтага жанру. Увазе слухачоў былі прадстаўлены знакамітыя рамансы на словы рускіх паэтаў у выкананні О.С. Кожух-Камінскай, Харэвіча В.М. і Харэвіча Ю.В., І. Шмяля, салістаў квартэта «Камертон». Сваёй творчасцю з прысутнымі падзяліліся ўдзельнікі літаратурнага аб'яднання «Белы бусел» В. Літошык і М. Чайнікаў. Рамантычны вечар даў магчымасць слухачам, хоць ненадоўга, пагрузіцца ў лірычную атмасферу XVIII-XX стагоддзяў.
*Кобрин-информ, 2018, 15 сакавіка, С.2.*

ЦРБ, 72 чал.

***7 сакавіка*** У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі для жаночай паловы Кобрынскай РААА «БелТІЗ» прайшоў вечар адпачынку «С праздником, милые женщины!», прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню. Старшыня арганізацыі Смяховіч Валянціна Мікалаеўна павіншавала удзельніц мерапрыемства і ўручыла памятныя падарункі.
Прысутныя сустракалі апладысментамі музычныя нумары, падрыхтаваныя вакальнай групай цэнтральнай бібліятэкі, Кірыеўскім А.П., Ястрэмскай З.В., Верамко С. Разнастайныя конкурсы і віктарыны далі магчымасць ўдзельнікам мерапрыемства раскрыць свой творчы патэнцыял.

ЦРБ, 52 чал.

## Мерапрыемствы да юбілею Хатынскай трагедыі

***21 сакавіка*** Напярэдадні Дня памяці трагедыі Хатыні супрацоўнікі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з кінатэатрам «Вясёлка» у Лукской СШ правялі гадзіну-рэквіем «Хатынь: говорящая тишина», прысвечаную 75-годдзю знішчэння Хатыні. Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў з трагічнымі падзеямі, якія адбыліся на беларускай зямлі 22 сакавіка 1943 года. З дапамогай відэапрэзентацыі «С памятью в сердце» навучэнцы здзейснілі віртуальнае падарожжа па Дзяржаўнаму мемарыяльнаму архітэктурна-скульптурнаму комплексу «Хатынь», створанаму як даніна памяці загінуўшым жыхарам вёскі і ўсім загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Напрыканцы мерапрыемства школьнікам паказаны фільм аб Хатынскай трагедыі «И будет жить Хатынь».

Лукская СШ, 82 чал.

***22 сакавіка*** У рамках мерапрыемстваў , прысвечаных 75 – годдзю Хатынскай трагедыі Лукская публічная бібліятэка сумесна з Шамятоўской публічнай бібліятэкай правялі для навучэнцаў Лукскай СШ урок гістарычнай памяці

«Страшная трагедыя спаленых вёсак». Бібліятэкары пазнаёмілі навучэнцаў з трагічнымі падзеямі, якія адбыліся ў в. Лука і в. Навасёлкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мерапрыемства заснавана на ўспамінах відавочцаў тых страшных падзей , жыхароў гэтых вёсак,«дзяцей вайны» Якаўчыц Марыі, Галавацкага Сяргея, Крыштафовіч Вольгі. У заключэнне мерапрыемства вучні прачыталі вершы, прысвечаныя Хатынскай трагедыі.

Лукская СШ, 60 чал.

***24 сакавіка*** Цэнтральная бібліятэка сумесна з кінатэатрам «Вясёлка» правяла гісторыка-літаратурны вечар «Время, которое нельзя забыть», прысвечаны 75-годдзю з дня знішчэння Хатыні. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел вучні старэйшых класаў ДУА «Сярэдняя школа №6 г. Кобрына». Вядучыя расказалі пра трагічны лёс вёскі Хатынь, у якой 22 сакавіка 1943 года было спалена 149 чалавек, з іх 75 дзяцей. У час мерапрыемства гучалі вершы, прысвечаныя Хатыні, зачытваліся ўрыўкі з «Хатынскай Аповесці» Алеся Адамовіча. Мерапрыемства завяршылася праглядам дакументальнага фільма пра гісторыю стварэння мемарыяльнага комплексу «Хатынь» - «И будет жыть Хатынь».

Кінатэатр “Вясёлка”, 56 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

***1 сакавіка*** Вечарына-пратэст супраць наркаманіі «Наркомания: от отчаяния к надежде» была прымеркавана да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам. Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання.
Оперупаўнаважаны аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Пстыга М.Д. патлумачыў падлеткам меру адказнасці за набыццё, ужыванне і збыт наркатычных сродкаў, расказаў аб трывожнай статыстыцы ў дачыненні да наркаманіі сярод моладзі. На мерапрыемстве прысутнічалі удзельнікі «Школы маладога кіраўніка», якіх бібліятэкары пазнаёмілі са спецыфікай бібліятэчнай прафесіі, прадэманстравалі відэаролік рэкламы паслуг бібліятэкі.
*Кобрынскі веснік, 2018, 10 сакавіка, С.3.*

ЦРБ, 82 чал.

***3 сакавіка*** Напярэдадні Дня праваслаўнай кнігі ў Гарадзецкім філіяле адбылася гадзіна інфармацыі «Вялікі Пост – усім пастам Пост». У мерапрыемстве прыняў удзел настаяцель храма Узнясення Гасподняга аграгарадка Гарадзец іерэй Георгій Червякоўскі. Айцец Георгій растлумачыў прысутным сутнасць Вялікага Паста і яго галоўныя пастулаты, правілы захавання паста і падрыхтоўкі да яго. Бібліятэкары правялі бібліяграфічны агляд праваслаўнай літаратуры, прадстаўленай у фондзе бібліятэкі. Мерапрыемства выклікала пазітыўны водгук у ўдзельнікаў і прапановы зрабіць падобныя сустрэчы пастаяннымі.

Гарадзецкі філ., 22 чал.

***4 сакавіка*** На базе інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра цэнтральнай раённай бібліятэкі у рамках праекта “Тэрыторыя інтэлекту” адбыўся чарговы турнір інтэлектуальнай гульні «Что? Где? Когда?» - «Эврика-8».

У турніры спаборнічалі 5 каманд эрудытаў г. Кобрына: «Старики-разбойники», «Эффект Доплера», «Пингвины», «Роза ветров», «Надежда» і каманда «Особое мнение» з г. Бяроза, якая заняла 1месца.
Партнёрам гульні выступіла піцэрыя «Pizza Italiana», якая прывязла прыз для каманды пераможцаў. Вядучы гульні - Кузьміч В.С.

ЦРБ, 52 чал.

***16 сакавіка*** У цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся семінар-практыкум «Лакальна-нарматыўная дакументацыя – як алгарытм дзейнасці публічнай бібліятэкі». Спецыялісты цэнтральнай бібліятэкі падрыхтавалі кансультацыі сельскім калегам па правілам унутраняга працоўнага распарадку, лакальным дакументам па ахове працы, колектыўнаму дагавору. Была прадстаўлена відэапрэзентацыя «Нарматыўна-прававое рэгуляванне дзейнасці публічных бібліятэк». Супрацоўнікі Магдалінскай, Паляцічскай, Осаўскай, Верхалескай публічных бібліятэк расказалі аб сваёй рабоце ў суадносінах з галоўнымі лакальнымі дакументамі.

ЦРБ, 51чал.

***18 сакавіка*** У рамках праекта «Тэрыторыя інтэлекту» ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся яшчэ адзін турнір інтэлектуальнай гульні «Что? Где? Когда?» «Сінхрон-Lite». У турніры спаборнічалі 7 каманд эрудытаў г. Кобрына: «Старики-разбойники», «Эффект Доплера», «Пингвины», «Роза ветров», «Надежда», «Magic is lost», «L&G» і каманда з г. Бярозы «Особое мнение». У напружанай барацьбе перамагла каманда «Особое мнение» з горада Бяроза. Партнёр гульні Pizza Italiana прадаставіў прыз для каманды пераможцаў гульні. Вядучы гульні - Кузьміч В.С.

ЦРБ, 60 чал.

***21 сакавіка*** У рамках Міжнароднага дня паэзіі адбылася сустрэча з паэтамі літаратуна-паэтычнага аб’ядканя “Белый аист»: Л.І.Лазюк, В.С.Клачковіч, В.М.Лукашук. Тэма размовы- малая радзіма.  Паэтамі  прадстаўлены новы зборнік вершаў "Зямля бацькоў дае натхненне". Прагучалі вершы і песні аб Радзіме, Кобрынскім краі. Бібліятэкарам арганізавана кніжная выстава "Дзівосны край, бацькоўская зямля". Навучэнцамі Залескай школы прадстаўлена выстава творчых работ "Мой родны кут, як ты мне мілы".

Залеская ПБ, 100 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі**

***23 сакавіка*** Ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў Залескай публічнай бібліятэцы для малодшых школьнікаў адбылося літаратурнае свята, прысвечанае 110-гадоваму юбілею Н.Носава «Ён кахаў дзяцінства ў людзях». Дзеці пазнаёміліся з біяграфіяй і творчасцю пісьменніка, успомнілі любімых герояў, ўдзельнічая  ў віктарынах, гульнях, конкурсах. Навучэнцы першых класаў былі прыняты ў рады ганаровых чытачоў бібліятэкі. Кніжная выстава «Носаў – пісьменнік з Сонечнага горада» прыцягнула ўвагу тых, хто яшчэ быў мала знаёмы з творчасцю выдатнага дзіцячага пісьменніка.

Залеская ПБ, 60 чал.

***23 сакавіка*** Тэвельская публічная бібліятэка правяла для вучняў 1-4 класаў Тевельскага дзіцячага саду-пачатковай школы свята кнігі "Торопитесь вы сюда, неделя книги к вам прришла!". Дзеці пазналі гісторыю правядзення Тыдня кнігі, сустрэліся з казачнымі персанажамі, актыўна бралі ўдзел у віктарынах, конкурсах і гульнях. Параможцы атрымалі салодкія прызы.

Тэвельская ПБ, 38 чал.

***24 сакавіка*** Тэатралізаваным прадстаўленнем "Добры свет любімых кніг" адкрыўся Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі для малодшых наведнікаў Батчынскай публічнай інтэграванай бібліятэкі. Дзяцей чакала сустрэча з любымымі казачнымі героямі: Каралевай Кнігай, Бурацінам, Нязнайкай, Чырвоным Капялюшыкам, Бабай Ягой, Віні-Пухам, Паштальёнам Печкіным і інш. Юныя чытачы прынялі актыўны ўдзел у літаратурных конкурсах, віктарынах, гульнях. Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі дыпломы, медалі "Лепшы чытач", падарункі, а ўсе разам - шмат цікавай і карыснай інфармацыі.

Батчынская ПБ, 85 чал.